**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А. Г. Бахановіч
______________________________
Рэгістрацыйны № _________/_____

# ТЭОРЫЯ КУЛЬТУРЫ
**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей:**
**6-05-0314-02 Культуралогія;**
**6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела ўстаноў
адукацыі Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ М. Б. Юркевіч
____________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі Рэспублікі
Беларусь
________________ С. М. Пішчоў
____________________

Старшыня вучэбна-метадычнага
аб'яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
_______________ Н. У. Карчэўская
_______________

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце дзяржаўнай установы
адукацыі «Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
________________ І. У. Цітовіч
________________

Эксперт-нормакантралёр
________________ ______________
____________________

Мінск 2025

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;
*Л. К. Кухто,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
кафедра маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»;
*Ю. В. Кавалёва,* загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ПРЫКЛАДНАЙ:**
кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 19.02.2025);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 26.02.2025);
навукова-метадычным саветам па культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, сацыяльна-культурным менеджменце і камунікацыях вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 28.02.2025)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя культуры» складзена для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі спецыяльнасцей 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў агульнай вышэйшай адукацыі.

*Мэты вучэбнай дысцыпліны:*

– паглыбленне сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі культуры;

– раскрыццё сутнасці культуры і заканамернасцей яе дынамікі;

– асэнсаванне ўнікальнага вопыту дыялогу культур, што асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі;

– фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з’яў культуры, які грунтуецца на разуменні навуковай карціны свету.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– выяўленне ўсеагульных заканамернасцей функцыянавання культуры;

– вызначэнне месца і ролі культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы развіцця;

– асэнсаванне асаблівасцей розных тыпаў культуры, перспектыў духоўнага развіцця чалавецтва;

– вывучэнне гісторыі сусветнай культуры як сістэмы, як цэласнасці;

– паказ значэння міфалогіі, філасофіі, мастацтва, рэлігіі, навукі як унікальных каштоўнасцей чалавецтва.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– асноўныя этапы развіцця культуры ў сувязі з сусветнай гісторыяй чалавецтва;

– суадносіны культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

*умець:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– аналізаваць ва ўзаемасувязі развіццё культуралогіі, рэлігіі, філасофіі, дасягненні навукі і адукацыі;

– засвоіць мабільную дыдактычную мадэль выкладання культуралогіі;

*валодаць:*

– асноўнымі заканамернасцямі культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва.

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя культуры» разлічана на студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі і ўлічвае сувязь з такімі гуманітарнымі дысцыплінамі, як «Сучасная палітэканомія», «Філасофія», «Паліталогія», «Педагогіка», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»; веданне ў цэлым асаблівасцей культурна-гістарычных эпох і атрыманне пэўных звестак па розных відах мастацтва. У вучэбнай праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Беларуская і сусветная літаратура», «Сусветная літаратура», «Этнаграфія», «Гісторыя Беларусі» і некаторымі іншымі.

Вучэбная праграма арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж гуманітарнымі і ўласна культуралагічнымі праблемамі. Пры гэтым тэорыя культуры разглядаецца як індыкатар стану матэрыяльнай і духоўнай культуры.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыіі, 6-05-0314-02 Культуралогія ў выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя культуры» студэнт павінен развіць наступныя ўніверсальныя кампетэнцыі:

– Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі.

– Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні.

Студэнты павінны набыць наступныя базавыя прафесійныя кампетэнцыі:

– Аналізаваць гісторыка-культурны працэс, разумець заканамернасці фарміравання культурна-творчых характарыстык асобы, ладу думкі і дзейнасці чалавека, які жыве ў гістарычна канкрэтным грамадстве.

– Аналізаваць этнакультурную спецыфіку традыцыйнай культуры Беларусі, этнічных працэсаў у Беларусі і ў сучасным свеце.

– Ацэньваць сацыяльныя і іншыя наступствы навуковага і тэхналагічнага развіцця, уплыў тэхнагенных і інфармацыйных працэсаў на змены ў сферы творчасці, культуры, камунікацыі і іншых галінах дзейнасці культуролага.

– Прымяняць сучасныя тэхналогіі сацыякультурнай камунікацыі ў прафесійнай дзейнасці.

На вывучэнне дысцыпліны «Тэорыя культуры» вучэбным планам прадугледжана 134 гадзіны, з іх 84 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 44 – лекцыі, 40 – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў навучэнцаў – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных часоў | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі |
| 1. | Уводзіны | 2 | |
| 2. | Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання чалавечай супольнасці | 2 | 2 |
| 3. | Асэнсаванне феномена культуры ў гуманітарным дыскурсе | 2 | 2 |
| 4. | Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні сутнасці і зместу культуры | 2 | 2 |
| 5. | Марфалогія культуры | 2 | 2 |
| 6. | Духоўная культура і яе сутнасць | 2 | 2 |
| 7. | Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест | 2 | 2 |
| 8. | Функцыі культуры | 2 | 2 |
| 9. | Культура сацыяльных супольнасцей | 2 | 2 |
| 10. | Масавая культура як сацыяльна-саслоўны тып культуры | 4 | 2 |
| 11. | Субкультура і контркультура, іх суадносіны | 2 | 2 |
| 12. | Тыпалогія культуры | 4 | 4 |
| 13. | Тыпалагічныя мадэлі культуры | 4 | 4 |
| 14. | Дынаміка культуры | 4 | 4 |
| 15. | Прырода і культура | 2 | 2 |
| 16. | Асоба і культура | 2 | 2 |
| 17. | Культура і цывілізацыя | 4 | 4 |
| | **Разам…** | 44 | 40 |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Тэма 1. Уводзіны*

Культуралогія як навуковая і вучэбная дысцыпліна.

Культура як сістэма і з’ява грамадства і аб’ект вывучэння. Культура ў сістэме вытворчасці і сацыяльнай рэгуляцыі. Культура і прырода. Артэфакт – антыпод прыроднаму. Дыверсіфікацыя навук аб культуры. Месца культуралогіі сярод гуманітарных навук. Галіны культуралогіі: фундаментальная, прыкладная, сацыяльная, педагагічная, гістарычная культуралогія, аксіялогія культуры, герменеўтыка культуры, псіхалогія культуры, культурная семіётыка і інш.

## *Тэма 2. Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання чалавечай супольнасці*

Міфалогія як сістэма поглядаў, заснаваная на ірацыянальным спосабе ўспрыняцця і адлюстравання свету, спецыфічны тып свядомасці, характэрны пераважна для архаічнай стадыі развіцця чалавека. Прыметы міфалагічнай свядомасці: а) універсальнасць існавання чалавека ў свеце; б) халістычнасць і сінкрэтызм; в) цыклічнасць успрыняцця часу і дынамічнасць успрыняцця прасторы. Міфалагічныя ўяўленні аб культуры.

Паглыбленне разумення культуры ў антычным грамадстве. Этымалогія канцэпту «культура». Культура як «апрацаванае асяроддзе людзей, арганізаванае з дапамогай спецыфічных чалавечых тэхналогій дзейнасці і насычанае вынікамі гэтай дзейнасці».

Уяўленне аб сутнасці культуры ў працах філосафаў Сярэдневякоўя (Аўрэлія Аўгусціна Блажэннага, Аўрамія Смаленскага, Кірылы Тураўскага, К. С. Ф. Тэртуліяна, Фамы Аквінскага і інш.). Выцясненне міфалогіі як тыпу светаадчування. Разуменне культурнай прасторы, якая створана на суб’ектна-аб’ектнай падзеленасці чалавека і Бога.

Дасягненне культуралагічнай думкі ў эпоху Адраджэння. Погляды на культуру С. Буднага, М. Кузанскага,Т. Кампанелы, М. Мантэня, Ф. Скарыны, Э. Ратэрдамскага і інш. Фарміраванне навукова-рацыянальнай сістэмы светапогляду на культуру.

Культуралагічныя веды ў эпоху Асветніцтва. Паглыбленне поглядаў на культуру ў працах Р. Дэкарта, Дж. Лока, Ф. Бэкана, Дж. Віко, Ж.-Ж. Русо, Вальтэра, Т. Гобса.

Развіццё культуралагічных ведаў у індустрыяльным грамадстве. Культуралагічная праблематыка ў працах І. Канта, Г. В. Ф. Гегеля, Ф. Ніцшэ і іншых філосафаў.

Трактоўка культуралагічных праблем у ХХ ст. Феномен духоўнага фарміравання асобы ў працах рускіх філосафаў. Экзістэнцыяльная культурфіласофія. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

### *Тэма 3. Асэнсаванне феномена культуры ў гуманітарным дыскурсе*

Функцыянальнае вызначэнне паняцця культуры і асноўныя характарыстыкі. Шматзначнасць паняцця культуры. Культура як творчасць і асобая сфера дзейнасці. Культура як свет знакаў. Культура як сума дасягненняў чалавецтва. Культура як «другая прырода». Свет культуры – свет каштоўнасцей. Культура як разнастайнасць і самабытнасць розных грамадстваў і як аснова разнастайных форм жыццядзейнасці. Культура як спецыфічная сістэма норм і сімвалаў. Культура як духоўны кампанент сукупнай вытворчасці. Культура як пошук сэнсаў. Сувязь культу з культурай.

### *Тэма 4. Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні сутнасці і зместу культуры*

Станаўленне культуралогіі як навукі. Каштоўнасныя і пазітывісцкія падыходы да культуры. Ідэі крэацыянізму, катастрафізму і эвалюцыянізму. Ідэі эвалюцыянізму і дыфузіянізму як аналітычны інструмент вывучэння культуры. Сімвалічны інтэракцыянізм. Марксісцкая канцэпцыя культуры. Цывілізацыйная школа як вывучэнне культурных макрасупольнасцей. Псіхааналітычныя канцэпцыі культуры.

Франкфурцкая школа ў культуралогіі. Крытыка прагрэсісцкай лініі развіцця культуры. Амерыканская антрапалагічная школа. Культурна-гістарычная школа. Гульнявая мадэль культуры. Структуралісцкая версія.

### *Тэма 5. Марфалогія культуры*

Разнастайнасць тэорый аб унутранай структуры культуры, яе арганізацыйна-функцыянальнай будове. Культура як адбітак структуры яе суб’екта. Структурныя ўзроўні суб’екта культуры: біялагічны, сацыяльны, культурны, цывілізаваны. Асноўныя структурныя ўзроўні культуры: духоўны, мастацкі, матэрыяльны. Унутранаасобасны від культуры. Знешнепрадметны від культуры. Формы культуры: духоўная, матэрыяльная. Мастацкая культура як сярэдзінны пласт культуры. Паўсядзённая і

спецыялізаваная культуры. Культура сацыяльнай арганізацыі і рэгуляцыі. Культура пазнання і рэфлексіі свету, чалавека і чалавечых адносін. Культура сацыяльнай камунікацыі, назапашання, захавання і трансляцыі інфармацыі. Культура фізічнай і псіхічнай рэпрадукцыі, рэабілітацыі і рэкрэацыі чалавека.

### *Тэма 6. Духоўная культура і яе сутнасць*

Сутнасць духоўнасці. Разнастайнасць духоўнага жыцця чалавека. Духоўна-сімвалічны характар культуры. Вызначэнне паняцця «духоўная культура». Міфалогія, рэлігія, мастацтва, навука (філасофія) як асноўныя формы духоўнай культуры. Прыярытэты духоўнай культуры. Функцыі духоўнай культуры: інфармацыйная, ментальная, знакава-сімвалічная, эстэтычная і інш.

### *Тэма 7. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест*

Матэрыяльная культура – аснова духоўнай. Умоўны падзел культуры на матэрыяльную і духоўную. Крытэрыі і прыметы матэрыяльнай культуры. Катэгорыі матэрыяльнай культуры: пароды жывёл, гатункі раслін, культура глебы, будынкі і збудаванні, шляхі зносін і транспартныя сродкі, інструменты, прыстасаванні, абсталяванне, сувязь і сродкі сувязі, тэхналогія.

Фундаментальныя структурныя пераўтварэнні відаў матэрыяльнай культуры ў ХХ – першай чвэрці ХХІ ст.

### *Тэма 8. Функцыі культуры*

Вызначэнне зместу паняцця «функцыя». Функцыі як сукупнасць роляў, якія выконвае культура ў адносінах соцыуму, якія стварае і выкарыстоўвае іх у сваіх інтарэсах. Сацыяльны характар функцый культуры. Тэорыя функцый у працах Э. Касірэра. Поліфункцыянальнасць культуры. Дыялектыка функцыянальнасці і дысфункцыянальнасці.

Класіфікацыя функцый. Функцыя вытворчасці новых норм, каштоўнасцей, значэнняў і ведаў. Адаптыўная функцыя. Камунікатыўная функцыя. Канцэпцыя Х. М. Маклюэна аб ролі камунікатыўных тэхналогій у гісторыі культуры. Тыпы камунікацыі: традыцыйная, функцыянальна-ролевая, масавая. Гульнявая функцыя культуры. Разуменне гульні ў працах І. Канта, Ф. Шылера, Ё. Хёйзінга. Асаблівасці гульні.

Ідэалагічная функцыя. Ідэалогія як кампанент свядомасці суб’ектаў культуры.

Інфармацыйная функцыя. Узроўні інфармацыйных патрэбнасцей суб’ектаў культуры: біялагічны, сацыяльны. Віды інфармацыі. Станаўленне інфармацыйнага грамадства.

Функцыя сацыялізацыі і інкультурацыі асобы. Нормы і значэнні як сродкі сацыялізацыі індывіда. Статуснае засваенне культуры ва ўмовах масавай вытворчасці.

Функцыя сацыяльнай інтэграцыі людзей. Распрацоўка тэорыі інтэграцыі прадстаўнікамі функцыянальнай антрапалогіі (Б. К. Маліноўскі, А. Р. Радкліф-Браўн і інш.). Супярэчлівы характар інтэгратыўнай функцыі культуры.

Функцыя дэмаграфічнага і сацыяльнага ўзнаўлення індывідаў соцыуму.

Кампенсаторная функцыя. Формы духоўнай і псіхалагічнай разрадкі і адпачынку ад праблем тэхнагеннага свету.

## *Тэма 9. Культура сацыяльных супольнасцей*

Асноўны прынцып фарміравання культурных сістэм. Агульныя рысы тыпаў сацыяльных супольнасцей. Этнічная культура як гістарычная аснова прафесійнай культуры. Роля народнай культуры ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу. Этнас як суб’ект народнай культуры. Індывідуальныя, групавыя, масавыя элементы народнай культуры. Функцыі народнай культуры: эстэтычная, выхаваўчая, утылітарна-практычная, абрадавая і інш. Ананімны, калектыўны, непрафесійны характар народнай культуры. Віды і формы народнай культуры. Творчыя стасункі і ўзаемадачыненні народнай і элітарнай культур.

Нацыянальны тып культуры. Буржуазія і капіталістычныя вытворчыя адносіны – асноўны фактар існавання нацыянальнай культуры. Сінтэтычны характар нацыянальнай культуры.

Сацыяльна-саслоўныя тыпы культуры. Эліта як вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства. Ідэя элітарнасці культуры ў працах М. А. Бярдзяева. Агульныя рысы, асаблівыя якасці і каштоўнасна-псіхалагічныя ўстаноўкі эліты. Нефармальная ўлада эліты.

Характэрныя рысы элітарнай культуры. Карпаратыўны характар элітарнай культуры. Духоўны арыстакратызм. Эстэтычная свабода. Глыбіня зместу і арыгінальнасць. Вытанчанасць формы. Наватарства. Індывідуальны пачатак і камерцыйная незалежнасць.

Культура горада і яе параметры. Функцыі суб’ектаў гарадской культуры.

Культура вытворцаў сельскагаспадарчых артэфактаў і яе функцыі.

Канфесійны тып культуры і яго спецыфіка. Псіхіка-кампесаторная функцыя канфесійнага тыпу культуры.

### *Тэма 10. Масавая культура як сацыяльна-саслоўны тып культуры*

Ірацыянальнасць масавых рухаў і масавай свядомасці. Уплыў НТР, урбанізацыі, разбурэння лакальных супольнасцей і сацыяльных меж на фарміраванне масавай культуры. Масавая культура як прадукт постіндустрыяльнага тыпу тэхналагічнага развіцця. Месца сучасных сродкаў камунікацыі і павышэння ўзроўню адукаванасці мас у дынаміцы масавай культуры. Дэмакратызацыя грамадства як каталізатар масавай культуры. Наркатычны характар масавай культуры. Прымітывізацыя чалавечых адносін, прыярытэт у маскульце грошай, поспеху, прапаганда канфармізму, жорсткасці, насілля. Натуралізм як рыса масавай культуры. Сэнсавы дыяпазон масавай культуры. Асноўныя жанры масавай культуры.

### *Тэма 11. Субкультура і контркультура, іх суадносіны*

Паняцце «субкультура» і яе сутнасць. Асноўныя рысы субкультуры і фактары іх фарміравання. Тыпалогія субкультур. Сацыяльныя функцыі субкультуры. Субкультурны выбух сучаснасці (А. Тофлер). Субкультуры моладзі XX – першай чвэрці XXI ст. (хіпі, бітнікі, панкі, готы, скінхеды, хакеры, рокеры, байкеры і інш.). Прычыны актуалізацыі субкультурных утварэнняў у сучасным беларускім грамадстве.

Паняцце «контркультура». Месца і роля контркультуры ў гістарычнай дынаміцы. Важнейшыя характарыстыкі контркультуры. Спецыфіка ўзаемасувязі культуры, субкультуры і контркультуры ў гісторыі.

### *Тэма 12. Тыпалогія культуры*

Крытэрыі і прынцыпы тыпалагізацыі культур. Колькасна-зместавая характарыстыка канкрэтна-гістарычных форм бытавання культуры. Праблема тыпалогіі ў фундаментальнай культуралогіі (М. А. Бярдзяеў, Ф. Ніцшэ і інш.).

Крытэрыі тыпалагізацыі культур: прасторава-геаграфічны, сацыяльны, фармацыйны, храналагічна-часавы, этнаграфічны і інш.

Прынцыпы тыпалагізацыі культур: рэгіянальна-тэрытарыяльны, дэмаграфічны, канцэптуальны, культурна-гістарычны, рэлігійны, этнанацыянальны, цывілізацыйны і інш.

Канкрэтна-гістарычныя тыпы культуры: прыродна-сімвалічны, рацыянальна-нарматыўны, антрапалагічны, пратэстанцка-рэфармісцкі, крытыка-асветніцкі, рамантычна-ўтапічны, індывідуальна-прагматычны, дэмакратычна-тэхнатронны, таталітарна-бюракратычны і інш.

### *Тэма 13. Тыпалагічныя мадэлі культуры*

Адзінства ўнутранага, псіхалагічнага ладу калектыўнай душы народа – аснова тыпалагічнай мадэлі О. Шпенглера. Прасімвал культуры. Тыпы культуры паводле О. Шпенглера.

Класіфікацыя культур М. Я. Данілеўскім. Дзейнасная прырода культуры. Славянскі культурна-гістарычны тып культуры і яго патэнцыял.

Культурна-гістарычная канцэпцыя К. Ясперса. Сутнасць паняцця «восевы час». Праметэеўскі тып культуры. Гуманістычная культура восевага часу.

Канцэпцыя цыклічнага развіцця культуры П. А. Сарокіна. Ідэацыйны, сенсетыўны і ідэалістычны тыпы культуры. М. Мід аб асаблівасцях узаемадзеянняў пакаленняў. Постфігуратыўны, конфігуратыўны, прэфігуратыўны тыпы культуры.

Характарыстыка традыцыяналісцкага і тэхнагеннага тыпаў культуры (Ж. Дэлёз, Ф. Гватары).

### *Тэма 14. Дынаміка культуры*

Культурныя працэсы і іх праяўленне ў дынаміцы культуры. Дынаміка ўнутраных працэсаў, іх узаемадзеянне з культурнай падзеяй. Важнейшыя культурныя працэсы: параджэнне культурных феноменаў; іх міжпакаленная трансляцыя і прастора культурнага свету; іх зменлівасць.

Разнастайнасць форм і механізмаў культурных змяненняў.

Паняцце «культурная дынаміка» і дэтэрмінанты культурных змяненняў, мадыфікацыя рыс культуры ў прасторы і часе. Флуктуацыя культуры (П. А. Сарокін «Сацыяльная і культурная дынаміка»). Інфармацыйная тэорыя адаптацыі Т. Парсанса.

Асноўныя канцэпцыі культурнай дынамікі: працоўная тэорыя марксізму, сінергетычная парадыгма «сістэмнага эфекту», тэорыя канфлікту, псіхааналітычны падыход да культурнай зменлівасці і інш. Лінейна-паступальныя, хвалепадобныя, цыклічныя, інверсійныя, выбуховыя змяненні (Ю. М. Лотман «Культура і выбух»).

Традыцыя як крыніца культурнай дынамікі. Грамадскі характар традыцыі. Агульнаславянскія вытокі беларускіх культурных традыцый.

Культурная інавацыя і шляхі яе ўзнікнення. Культурныя мутацыі. Этапы ўкаранення культурнай інавацыі: адбор, мадыфікацыя, інтэграцыя. Узаемадзеянне традыцый і навацый.

Запазычанні як від культурнай дынамікі. Псіхасацыяльныя фактары прыняцця і адмаўлення культурных запазычанняў.

Культурная дыфузія і яе напрамкі. Аналіз часавых, пrasторавых характарыстык культур Ф. Грэбнерам, Ф. Ратцэлем, Л. Фрабеніусам, К. Уіслерам. Механізмы культурных дыфузій. Гарызантальная і вертыкальная дыфузія.

### *Тэма 15. Прырода і культура*

Прырода і культура як антыноміі, якія ўзаемадапаўняюць быццё чалавека. Антынамія прыроднага і культурнага. Біясацыяльны дуалізм чалавека як суб’екта культуры. Свет прыроды і свет культуры. «Натура» і «культура»: іх узаемадзеянні. Дэмакрыт аб культуры як другой прыродзе. Разуменне прыроднага і культурнага ў еўрапейскай культурфіласофскай думцы. Ідэя канфрантацыі і ідэя коэвалюцыі.

Роля прыроды ў станаўленні і развіцці культуры. Прыродныя сімвалы ў культуры. Фарміраванне актывісцкай парадыгмы. Ідэя пазнання прыроды і культуры (Ч. Р. Дарвін, А. Басціян, Э. Б. Тайлар, Л. Г. Морган, Л. Э. Уайт і інш.). Узнікненне экалогіі як навукі.

Тэорыя коэвалюцыі чалавека, грамадства і культуры (А. Л. Кробер, М. Маісееў). Ідэя «ўстойлівага развіцця» прыроды, культуры і асобы. Глабальныя праблемы сучаснай цывілізацыі і шляхі іх вырашэння (недахоп прыродных рэсурсаў, скарачэнне біялагічнай разнастайнасці, забруджванне паветра, планетарнае пацяпленне, COVID-19 і інш.).

### *Тэма 16. Асоба і культура*

Чалавек як творца культуры і як вынік яе ўздзеяння. Паняцці «структура» і «сутнасць асобы». Структура асобы. Узроўні асобаснай інтэграцыі: сацыяльна-ролевы, характаралагічны, экзістэнцыяльны. Асноўныя экзістэнцыяльныя каштоўнасці і структуры (Ж.-П. Сартр, П. Ціліх, В. Э. Франкл, К. Ясперс і інш.).

Важнейшыя канцэпцыі чалавека: антычны, касмацэнтрычны, тэацэнтрычны, гуманістычны, homo sapiens, homo digital і інш. Чалавек у разуменні культурфілосафаў эпох мадэрну і постмадэрну.

Спецыфіка дзейнасці чалавека. Творчасць як асноўны тып асобаснай дзейнасці. Спосабы і формы засваення культуры асобай.

Інтэрыярызацыя і яе стадыі. Хамінізацыя – першы этап уваходжання чалавека ў культурную прастору. М. Херскавіц аб спантанным характары хамінізацыі.

Фарміраванне асобы ў працэсе сацыялізацыі. Т. Парсанс аб інтэграцыі індывіда ў сацыякультурную сістэму. Адукацыя і выхаванне як састаўныя часткі сацыялізацыі.

Паняцце «інкультурацыя». М. Мід, Д. Мацумота, М. Херскавіц аб сутнасці інкультурацыі. Спосабы перадачы культурнай інфармацыі: вертыкальная, гарызантальная і непрамая трансмісіі. Пазітыўныя і негатыўныя псіхалагічныя механізмы інкультурацыі.

Акультурацыя як працэс змянення каштоўнасных арыентацый, ролевых паводзін, сацыяльных установак у выніку ўзаемадзеяння розных культур. Стратэгіі акультурацыі: асіміляцыя, інтэграцыя, маргіналізацыя, сепарацыя.

### *Тэма 17. Культура і цывілізацыя*

Сутнасць паняцця «цывілізацыя». Узаемаадносіны культуры і цывілізацыі. Разнастайнасць тэарэтычных падыходаў да сутнасці цывілізацыі. Цывілізацыя і варварства. Цывілізацыя як грамадства роўнасці і справядлівасці. Разуменне цывілізацыі як універсальнага, няўхільнага, паступальнага руху. Цывілізацыя як матэрыяльная аснова культуры. Цывілізацыя як сістэма сацыякультурных структур, інстытутаў і прадуктаў чалавечай працы. Характар цывілізацыі: прагматычны, «плебейскі». Сферы цывілізацыі: матэрыяльнае багацце, вытворчасць, тэхніка, дабрабыт і камфорт, сістэма дзяржавы і права. Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў культуры і цывілізацыі. Духоўна-сімвалічны характар культуры. М. А. Бярдзяеў аб паходжанні культуры.

Стадыі развіцця і тыпы цывілізацый. Аграрна-традыцыйная цывілізацыя і яе характарыстыка. Індустрыяльная, або тэхнагенная, цывілізацыя і яе мэты. Постіндустрыяльная цывілізацыя і яе адметнасці. Фарміраванне глабальнай цывілізацыі і яе негатыўныя і пазітыўныя наступствы. А. Тофлер, Ф. Фукуяма, С. Ф. Хантынгтан аб сцэнарыях развіцця цывілізацый.

Цывілізацыі Захаду і Усходу і іх узаемадачыненні.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Борзова, Е. П.* Сравнительная культурология : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Е. П. Борзова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 554 с. – С. 9–68, 74–144, 156–206, 314–384, 407–497.

2. *Махлина, С. Т.* Семиотика культуры повседневности : учебник для вузов / С. Т. Махлина. – 2-е изд., доп. – М. : Юрайт, 2020. – 255 с. – С. 6–43, 52–92, 103–174, 184–239.

3. *Оганов, А. А.* Теория культуры : учеб. пособие / А. А. Оганов, И. Г. Хангельдиева. – 6-е изд., стер. – СПб. : Планета музыки, 2020. – 560 с. – URL: https://e.lanbook.com/book/151838 (дата обращения: 27.04.2022).

4. *Семилет, Т.А.* Исследования культуры в современном мире : учеб. пособие для бакалавриата и магистратуры / Т. А. Семилет. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2019. – 137 с. – С. 12–39, 46–76, 84–101.

5. *Смолик, А. И.* Субкультурные молодежные формирования XXI века : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности магистратуры «Культурология» / А. И. Смолик, Л. К. Кухто, О. Л. Гутько. – Минск : РИВШ, 2022. – 195 с. – С. 19–45, 46–65, 73–105.

6. *Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : [б. в.], 2008. – 279 с. – С. 133–174.

*Дадатковая*

1. *Гуревич, П. С.* Культурология / П. С. Гуревич. – М. : Знание, 1994. – 288 с.

2. *Иконникова, С. Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С. Н. Иконникова. – СПб. : С.-Петерб. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.

3. История и теория культуры : учеб. пособие для академического бакалавриата / В. П. Большаков, К. Ф. Завершинский, Л. Ф. Новицкая ; под общ. ред. В. П. Большакова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2018. – 289 с.

4. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб. : Петрополис, 1997. – 205 с.

5. *Кармин, А. С.* Культурология / А. С. Кармин. – СПб. : Питер, 2006. – 464 с.

6. *Лоу, Сета.* Пространственное воплощение культуры. Этнография пространства и места = Spatializing culture. The ethnography of space and place / Сета Лоу. – М. : Новое литературное обозрение, 2024. – 398 с.

7. *Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск : АСАР, 2008. – 848 с.

8. *Махлина, С. Т.* Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – М. : Юрайт, 2020. – 194.

9. *Назаретян, А. П.* Взаимодействие культур и социумов в контексте всемирной истории / А. П. Назаретян. − М. : ЛКИ, 2007. – 256 с.

10. *Никитина, И. П.* Философия искусства : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным наукам : в 2 ч. – Ч. 2 / И. П. Никитина. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 229 с.

11. *Никитина, И. П.* Философия искусства : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям : в 2 ч. – Ч. 1 / И. П. Никитина. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 211 с.

12. *Почепцов, Г. Г.* Теория коммуникаций / Г. Г. Почепцов. – М. : Релф-бук, 2001. – 656 с.

13. Теория межкультурной коммуникации : учебник и практикум для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / под ред. Ю. В. Таратухиной, С. Н. Безус. – М. : Юрайт, 2020. – 264 с.

14. *Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М. : Прогресс, 1991. – 640 с.

15. *Тоффлер, Э.* Третья волна / Э. Тоффлер. – М. : АСТ, 2002. – 776 с.

16. *Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М. : РОССПЭН, 2004. – 960 с.

17. *Флиер, А.* Культурология для культурологов / А. Флиер. – М. : Академ. проект, 2000. – 492 с.

18. *Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М. : АСТ, 1991. – 220 с.

19. *Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Минск : Коллегиум, 1992. – 253 с.

20. *Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2003. – 603 с.

21. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М. : Просвещение, 1990. – 320 с.

22. *Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М. : Политиздат, 1991. – 528 с.

## Метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; праектныя тэхналогіі; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады); метад аналізу канкрэтных сітуацый; гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

У якасці элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнта магчыма выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый: падрыхтоўка і абарона тэматычных паведамленняў, рэфератаў, эсэ, мультымедыйных прэзентацый, пры ацэньванні якіх звяртаецца ўвага на змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладання матэрыялу, крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення і г. д.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе абумоўлена неабходнасцю павышэння якасці адукацыі для будучага спецыяліста сацыякультурнай сферы, якаснага размеркавання часу на засваенне матэрыялу падчас лекцыйных, семінарскіх, практычных заняткаў, патрабаваннямі да адаптацыі да сусветнай адукацыйнай прасторы. Вышэйадзначанае фарміруе статус самастойнай работы студэнтаў як абавязковага базавага элемента прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

З мэтай павышэння эфектыўнасці неабходна прытрымлівацца наступных рэкамендацый:

– абазначыць перад пачаткам семестра найбольш ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесіянальнай і асобаснай кампетэнтнасці спецыяліста;

– на належным метадычным узроўні арганізаваць самастойную работу;

– ажыццяўляць перыядычны кантроль за СРС і кіраўніцтва ёю;

– стварыць спрыяльныя ўмовы для яе ажыццяўлення;

– рэкамендаваць неабходную вучэбную, навуковую літаратуру, перыядычныя выданні культуралагічнага профілю;

– праводзіць пры неабходнасці кансультаванне і карэкцыю памылак студэнтаў, якія дапускаюцца ў працэсе самастойнага вывучэння вызначаных тэм;

– падвесці вынікі самастойнага засваення студэнтамі пытанняў вызначаных тэм, выкарыстоўваючы розныя формы кантролю (тэсты, эсэ, калёквіумы, рэфераты і даклады).

## Прыкладны пералік заданняў
## для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прымяняюцца наступныя формы кіруемай самастойнай работы:

– кантралюемая самастойная праца ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў, уключаючы пісьмовыя апытанні з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка і прадстаўленне мультымедыйных прэзентацый на семінарскіх занятках;

– дыскусіі па тэмах: «Асэнсаванне феномена культуры ў гуманітарным дыскурсе», «Функцыі культуры».

Выкананая праца павінна адлюстроўваць ступень засваення тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна думаць, лагічна разважаць, ставіць пытанні, абагульняць, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

*Вучэбнае выданне*

**ТЭОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**
**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей: 6-05-0314-02 Культуралогія; 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі**


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2025. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Лічбавы друк.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.